3. Пушкин, А. С. Евгений Онегин. Роман в стихах. – Гл. 7, XXXVIII [Электронный ресурс] / А. С. Пушкин. – Режим доступа: http://www.stihi-rus.ru/1/evgeny_onegin-7.htm. – Дата доступа: 01.11.2016.
4. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. / Беларус. Сав. Энцыкл.; рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 375 с.
5. Vertigo. Круговорот образов, понятий, предметов / под ред. У. Эко. – М.: Слово / Slovo, 2009. – 408 с.

**Л. К. Кухто** *(Мінск, Беларусь)*

## АРХІТЭКТУРНАЯ СПАДЧЫНА ДЖУЗЭПЭ ДЭ САКА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

XVII–XVIII стст. – гэта гістарычная эпоха, у плыні якой культура заходнееўрапейскіх краін набывае тую форму, якая вылучае Еўропу з іншых рэгіёнаў і краін. Контуры новаеўрапейскай культуры пачалі вызначацца ў XVII ст. Рэфармацыя стала пачатковым этапам у развіцці культуры новага тыпу. Яна праклала шлях да пераасэнсавання дагматыкі хрысціянства. Пратэстантызм сваім фактам існавання зацвердзіў магчымасць рознага разумення Святога Пісання. Духоўная атмасфера ў грамадстве пачынае змяняцца. Манаполія царквы на пасрэдніцтва ў стасунках чалавека і Бога руйнуецца. У барацьбе з царквой былі закладзены асновы навуковага прыродазнаўства. Вядомыя мысліцелі Новага часу Ф. Бэкан, Т. Гобс, Р. Дэкарт, Б. Спіноза, Г. Лейбніц і іншыя вызвалілі філасофію ад схаластыкі і павярнулі яе тварам да навукі. Асновай філасофскага пазнання для іх становіцца не сляпая вера, а розум, які абапіраецца на логіку і факты. Паступова ўся грамадская свядомасць набывае незалежнасць ад рэлігіі. Еўрапейская культура, захоўваючы свае хрысціянскія карані, хрысціянскія каштоўнасці і ідэалы, з часам спараджае дух лібералізму і нават атэізму. Хрысціянская рэлігія застаецца найважнейшым фактарам духоўнага жыцця грамадства, але яе манапольнаму ўплыву на культурную сферу прыходзіць канец. Еўрапейская культура паступова становіцца свецкай. З Новага часу бярэ пачатак і другая асаблівасць еўрапейскай культуры – яе шматнацыянальнасць, полілінгвізм. Сярэдневяковая латынь саступае месца нацыянальным мовам, што, з аднаго боку, узбагачае еўрапейскую культуру традыцыямі і вопытам народнай творчасці, а з другога – робіць дасягненні культуры больш даступнымі для народаў Еўропы. Пачынаецца падзел нацыянальных культур, што паслужыла падставай развіцця агульнаеўрапейскай культуры, адзінай у сваёй разнастайнасці. Кантакт і ўзаемадзеянне культур – гэта адна з найважнейшых умоў культурнага прагрэсу, які ў Новы час выводзіць Еўропу на лідзіруючае месца ў свеце. У краінах Еўропы фарміруюцца арыгінальныя мастацкія школы і літаратурныя плыні, у якіх па-рознаму знаходзяць выражэнне мастацкія стылі таго часу – барока, ракако і класіцызм.

Беларуская культура XVIII ст. неадназначная і неаднолькавая ў сваім развіцці. Гэта асабліва тычыцца мастацкіх стыляў. Да сярэдзіны XVIII ст.

вызначальную ролю адыгрывала барока. Але з 1750-х гг. у мастацкае жыццё актыўна ўваходзіць напрамак ракако, а з канца XVIII ст. – класіцызм. Другая палова стагоддзя і яго канец пазначаны суіснаваннем у мастацтве названых стыляў і кірункаў. У архітэктуры, жывапісе, скульптуры, графіцы гэта адбывалася па-рознаму. У сувязі са сваімі спецыфічнымі якасцямі кожны з відаў мастацтва засвойваў або адмаўляў пэўную стылістыку.

Мастацкае жыццё на тэрыторыі Беларусі ў XVIII ст. канцэнтравалася ў асноўным у буйных прамысловых і палітычных цэнтрах – Вільні, Гродне, Полацку, Мінску. Тут дзейнічалі навучальныя ўстановы. Галоўным чынам іх заснавальнікамі былі ордэны езуітаў, бернардынаў, піяраў, братэрства. Найбольш уплывовымі з'яўляліся Віленская і Полацкая езуіцкія акадэміі. Матэрыяльнай падставай для станаўлення барока стала архітэктура. З канца XVII і асабліва ў XVIII ст. важную ролю ў развіцці культуры пачалі адыгрываць буйныя магнацкія маёнткі, дзе засноўваліся тэатры, збіраліся бібліятэкі, архівы, карцінныя галерэі, калекцыі археалагічнага і этнаграфічнага характару. Сярод такіх цэнтраў вылучаюцца Нясвіж, Шклоў, Слуцк, Магілёў, Слонім. Узаемадзеянне Беларусі з культурным жыццём Заходняй і Цэнтральнай Еўропы даволі ярка праявілася ў палацавым дойлідстве і развіцці садова-паркавага мастацтва. У мастацкім вырашэнні будаўніцтва сядзіб і палацаў можна заўважыць матывы позняга барока. З XVII ст. замкі сталі паступова страчваць сваю ахоўную ролю і набылі выгляд палацавых ансамбляў. У найбольш старажытных, як, напрыклад, у Нясвіжскім, адбыліся перабудовы, якія наблізілі такія комплексы да адкрытага, парадна-прадстаўнічага варыянта. У пышных магнацкіх рэзідэнцыях канцэнтраваліся галоўныя асаблівасці беларускага дойлідства, адметныя і своеасаблівыя рысы вярхушкі тагачаснага грамадства, яго імкненне да раскошы. Неад'емнай часткай палацавых ансамбляў быў парк. Як і ў Заходняй Еўропе XVII–XVIII стст., гэта рэгулярна спланаваны комплекс, куды ўваходзілі штучныя сажалкі, тэрасы, геаметрычная сетка алей, мудрагеліста афармленая расліннасць. Сярод буйных палацавых комплексаў на тэрыторыі Беларусі вылучаюцца палацы Агінскіх у Слоніме (1768), Чартарыйскіх у Воўчыне (Камянецкі р-н, 1732), Радзівілаў у Дзятлаве (1751), Валовічаў у Свяцку (1779), Тызенгаўзаў у Гродне (1760).

Прадстаўнікі роду Тызенгаўзаў пакінулі яркі след у гісторыі Беларусі. Дзяржаўны і грамадскі дзеяч ВКЛ мецэнат Антоній Тызенгаўз (1733–1785) як адзін з прадстаўнікоў гэтага роду карыстаўся вялікай павагай і даверам літвінскай шляхты. У свой час ён быў вядомы як ініцыятар буйнамаштабных пераўтварэнняў ВКЛ у адміністрацыйнай вобласці, прамысловасці, транспартных зносінах, сельскай гаспадарцы. Таксама А. Тызенгаўз быў знакаміты сваёй рознабаковай духоўна-асветніцкай дзейнасцю. Прытрымліваючыся ідэй эпохі Асветніцтва і заходнееўрапейскай моды, Тызенгаўз засноўвае парафіяльныя школы, Гродзенскі тэатр, Гродзенскую музычна-тэатральную школу і Гродзенскую друкарню [2, с. 677].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адміністрацыйным цэнтрам яго дзейнасці становіцца забудова прадмесця Гродна – Гарадніца. Для ажыццяўлення сваіх планаў у 1771 г. А. Тызенгаўз запрашае італьянскага архітэктара Джузэпэ дэ Сака (1735) – аднаго з найбуйнейшых архітэктараў барока і класіцызму, прыдворнага архітэктара караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага. Джузэпэ дэ Сака быў прыняты на службу ў якасці каралеўскага архітэктара з усталяваным акладам у 600 злотых. У Рэчы Паспалітай Д. Сака атрымлівае шэраг вайсковых званняў ВКЛ, а ў 1775 г. – шляхецтва [5, с. 536]. Прыступіўшы да працы ў Гродне, Д. Сака сумесна з архітэктарам каралеўскага варшаўскага двара І. Мёзерам распрацоўвае праекты шматлікіх будынкаў Гарадніцы: гарадскога ансамбля, які з'яўляўся часткай эканамічнага праекта А. Тызенгаўза, закліканага падняць эканоміку рэгіёна і наблізіць узровень сацыяльнага жыцця да лепшых еўрапейскіх узораў. Ёсць меркаванне, што І. Мёзер і Д. Сака творча падышлі да асэнсавання спадчыны італьянскага архітэктара з Падуі А. Паладыё, які яшчэ ў другой палове XVI ст. паспрабаваў злучыць дасягненні антычнай архітэктуры з яе рацыянальным пачаткам і новае эмацыйнае ўспрыманне навакольнага свету. Плошча Тызенгаўза сфарміравалася ў 1765–1785 гг. і з'яўлялася адміністрацыйным і культурным цэнтрам Гарадніцы. На ёй размяшчаліся Дом адміністратара, Дом «крывая Афіцына», музычная школа. Акрамя гэтага, у ансамбль Гарадніцы ўваходзілі батанічны сад, медыцынская акадэмія і ўласны палац А. Тызенгаўза.

Дом адміністратара быў пабудаваны па праекце Д. Сака ў 1780 г. Першапачаткова ў доме размяшчаліся віцэ-адміністратар каралеўскай эканоміі і канторы служачых, якія займаліся зборам падаткаў. У 30-х гадах XIX ст. у будынку працавала паштовая кантора, а ў 1919 г. у ім размясцілі частку дакументаў Гродзенскай губерніі. Зараз тут знаходзіцца Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.

Пад уплывам ідэй Асветніцтва значныя змены адбываліся ў тэатральным жыцці Беларусі. Калі ў часы барока ад яго патрабавалася, каб яно здзіўляла гледача, уздзейнічала на яго эмоцыі, то ў эпоху Асветніцтва тэатру адводзілася роля выхавальніка грамадства. Тэатр Тызенгаўза ў Гродне з'яўляецца помнікам архітэктуры XVIII ст. і першым публічным тэатрам горада. Будынак тэатра пабудаваны ў 1772 г. пад кіраўніцтвам архітэктараў І. Мёзера і Д. Сака, хаця сам тэатр пачаў функцыянаваць 30 красавіка 1769 г. Першапачаткова будаўніцтва было задумана як працяг палаца Тызенгаўза. Па праекце І. Мёзера тэатральная зала павінна была мець 22 ложы і 2 ярусы, партэр і сцэну з кулiснымі машынамі для перамяшчэння дэкарацый. Будаўніцтва тэатра завяршаў архітэктар Д. Сака. У 1780 г. пад яго кіраўніцтвам быў узведзены будынак у стылі барока. Галоўная тэатральная зала фарміравалася па «італьянскай крывой» і ўяўляла сабой памяшканне з амфітэатрам і яруснымі галерэямі па перыметры. Першапачаткова ў тэатральнай трупе пераважалі італьянскія артысты, а да 1778 г. іх змянілі вучні Гродзенскай музычна-тэатральнай школы Тызенгаўза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У 1802 г. пад кіраўніцтвам Саламеі Дэневеер быў створаны невялікі ансамбль вакалістаў і інструменталістаў, які праз некаторы час пераўтвараецца ў пастаянны калектыў з вялікім балетным і оперным рэпертуарам. Трупа лічылася адной з лепшых не толькі ў Беларусі, але і ў Еўропе. Пасля смерці С. Дэневеер тэатр узначаліў Ян Шыманскі. З 1984 г. у будынку размяшчаецца тэатр лялек, які з'яўляецца адным з лепшых у краіне.

Для патрэб тэатральнай школы ў 1774–1780 гг. быў прыстасаваны будынак у стылі позняга барока, які атрымаў назву «музычны флігель», «крывая Афіцына» – ключавая пабудова ў кампазіцыі плошчы, пабудаваны ў 1765 г. Дом меў крывалінейны малюнак у плане, што было абумоўлена асаблівасцю архітэктурнага ансамбля плошчы. Першапачаткова флігель меў два паверхі з мансардай і калідорную планіроўку. На першым і другім паверхах размяшчаліся невялікія залы і класы для заняткаў. Пасля рэканструкцыі мансардны паверх быў перабудаваны ў трэці, дзе знаходзіліся спальні вучняў, жылыя пакоі выкладчыкаў школы. У школе вучыліся дзеці прыгонных сялян і мяшчан з 8–10-гадовага ўзросту, якіх адбіралі пры наяўнасці музычных здольнасцей па загадзе А. Тызенгаўза. Былі створаны 3 класы, дзе вучні набывалі навыкі ігры на скрыпцы, альце, віяланчэлі, кантрабасе, віёле, флейце, габоі, кларнеце, фагоце, трубе, клавікордах. У праграму заняткаў уваходзілі таксама танец, спевы, нотная грамата, тэорыя музыкі і кампазіцыя. Кіраўніком школы быў скрыпач і капельмайстар Л. Сітанскі, педагогамі – кампазітар К. Абатэ, музыканты Д. Пташынскі, А. Тумін, Т. Вежбаловіч, Ф. Бірона, С. Швед, Я. Пашкоўскі, італьянскія харэографы Г. Пецінэцці, К. Марэлі і інш. Школа давала добрую падрыхтоўку, яе выхаванцы выступалі ў спектаклях тэатра. Пасля адстаўкі А. Тызенгаўза школа была пераведзена ў Паставы. Калі тэатральная трупа паехала ў Варшаву, у будынку школы пасяліліся музыканты капэлы, некаторыя з якіх пражывалі ў ім да 1795 г. У першай палове XIX ст. дом быў выкуплены з мэтай перабудовы для патрэб кантрольнай палаты. Пазней будынак быў прададзены графу Друцкіх-Любецкіх. У 1956 г. яго зноў перабудавалі пад жыллё.

У ансамбль Гарадніцы ўваходзіў і ўласны палац Тызенгаўза, таксама спраектаваны Д. Сака, які, на жаль, не захаваўся падчас Першай сусветнай вайны (згарэў у 1915 г.). Захавалася толькі замалёўка яго дваравога фасада, выкананая ў другой палове XIX ст. Напалеонам Ордам.

Творчымі намаганнямі Д. Сака былі створаны некалькі каралеўскіх рэзідэнцый вакол Гродна і праведзена рэканструкцыя каралеўскага Новага замка, пабудаванага для караля Аўгуста III па праекце М. Д. Пёпельмана. У 1771–1780 гг. Д. Сака выконвае шэраг заказаў мясцовых магнатаў, праектуе некалькі вядомых палацава-паркавых ансамбляў і гарадскіх рэзідэнцый, такіх як Свяцкі палац магнатаў Валовічаў, Шчорсаўскі палац Храптовічаў, палацы Тызенгаўза ў Паставах і Вільні.

Акружаны пейзажным паркам з сістэмай штучных вадаёмаў, Свяцкі палац быў пабудаваны ў вёсцы Свяцк Гродзенскага раёна і з'яўляўся фамільнай рэзідэнцыяй магнацкага роду Валовічаў. Палац складаўся з трох двухпавярховых карпусоў: цэнтральнага і двух флігеляў, якія былі злучаны паміж сабой гале-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэямі. У афармленні інтэр’ераў у асноўным былі ўжыты арнаментальная лепка і роспіс у стылях барока і класіцызму. Панэлі сцен, каміны, дзверы, люстры, рамы для люстэркаў, кансолі, вазоны, мэбля былі выкананы па эскізах і пад кіраўніцтвам Д. Сака мастакамі А. Смуглевічам, Т. Манькоўскім. У комплекс таксама ўваходзіла неагатычная капліца-пахавальня XIX ст. і гаспадарчыя пабудовы. У савецкі час у Свяцкім палацы размяшчаўся санаторый. Па даных на 2015 г. будынак належыць санаторыю «Азёрны», аднак знаходзіцца ў занядбаным стане [3, с. 432].

Сядзіба Храптовічаў была пабудавана ў Шчорсах Навагрудскага раёна па праекце Д. Сака, аздабленне інтэр’ераў выконваў Карл Спампані, будаўнічымі работамі кіраваў французскі архітэктар Якуб Габрыэль. Такім чынам, у перыяд 1770–1776 гг. у Шчорсах працавала адна з самых моцных па творчым патэнцыяле архітэктурных каманд Рэчы Паспалітай. Палац Храптовічаў быў першай буйной працай Джузэпэ дэ Сака, ён спалучаў прыёмы позняга барока і ранняга класіцызму. Галоўны корпус палаца ўяўляў сабой прамавугольны ў плане аднапавярховы будынак, падняты на невысокі падмурак. У канцы XVIII ст. была прыбудавана бібліятэка. Будынак у стылі класіцызму ўзвялі спецыяльна для захоўвання знакамітай бібліятэкі Храптовічаў. У свой час І. Ю. Храптовічам была сабрана вялікая калекцыя старажытных рукапісаў і геаграфічных карт. У XIX ст. сядзіба Храптовічаў была важным культурным цэнтрам. Сюды наведваліся Адам Міцкевіч, Уладзіслаў Сыракомля, Ян Чачот. У Першую сусветную вайну палац Храптовічаў пацярпеў ад ваенных дзеянняў і пазней быў разабраны, бібліятэку вывезлі і перадалі Кіеўскаму ўніверсітэту. Пасля Другой сусветнай вайны збудаванні комплексу прыйшлі ў канчатковы заняпад. У адносна нядрэнным стане захаваліся толькі будынкі левага флігеля і бібліятэкі, парк быў запушчаны і набыў рысы лесапаркавай зоны.

Сядзіба Станіславова – загарадная рэзідэнцыя караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, створаная ў другой палове XVIII ст. паводле праекта Д. Сака ў стылі позняга барока. На паўкруглым эркеры галоўнага прастакутнага будынка сядзібы красуецца асабістая манаграма караля Станіслава Аўгуста – тры літары S. A. R. (скарочанае ад Stanislaus Augustus Rex – Станіслаў Аўгуст, кароль). Да нашых дзён захаваліся два флігелі, пабудаваныя з абодвух бакоў цэнтральнага будынка. Сядзіба стаіць на ўзвышшы, дзе ляжыць дарога да галоўнага будынка ансамбля. Рэзідэнцыя мае форму прамавугольніка, цэнтральная частка якога звязвае паміж сабой некалькі пакояў (парадныя залы і вестыбюль). На тэрыторыі сядзібы размешчаны пейзажны парк. У 1953 г. рэзідэнцыя апошняга польскага караля была перададзена Гродзенскаму сельскагаспадарчаму інстытуту [4, с. 457].

У час свайго кіравання будаўнічай школай Д. Сака працаваў таксама ў Паставах (1770-я гг.), Ішчалне (1776 г.), Добасне (1781 г.), быў прызначаны галоўным архітэктарам на будаўніцтве каралеўскіх мануфактур у ВКЛ. Пабудаваў Гродзенскую Аўгустоўскую сядзібу, удзельнічаў у афармленні інтэр’ераў і рэканструкцыі езуіцкага касцёла (1773 г.), ратушы (1775 г., разам з арх. Фрэйліхам) у Гродне [1, с. 603]. Ім быў створаны праект ратушы ў Вільні (1784 г.), які, на жаль,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не ўдалося ажыццявіць. Як мяркуецца, Д. Сака памёр у 1798 г. у гродзенскім доме масонаў і быў пахаваны на гарадзенскіх каталіцкіх могілках. У 2008 г. на беразе ручая Гараднічанка быў адкрыты помнік вядомаму архітэктару. Для скульптуры, якая прадстаўляе зборны вобраз архітэктараў, што будавалі Гродна, было абрана часовае месца побач з домам, узведзеным Д. Сака і ў якім ён жыў. Аўтар скульптуры Аляксандр Анціпін адлюстраваў галоўнага архітэктара ВКЛ, седзячы на лавачцы, апранутым па модзе XVIII ст.: у трохвуголку з пер'ем, камізэльку-весту з доўгімі рукавамі, упрыгожанымі валанамі і жабо.

Такім чынам, перыяд з XVII па XVIII ст. стаў перыядам значнага і разнапланавага развіцця Беларусі. Культурнае развіццё было звязана з ідэалогіямі і напрамкамі еўрапейскіх краін, у тым ліку і з Італіяй. Менавіта дамінуючыя італьянскія тэндэнцыі развіцця мастацтва выконвалі ролю культурнага моста паміж захадам і ўсходам Еўропы, дзякуючы гэтаму беларускай культуры ўдалося дасягнуць сваіх высокіх вяршыняў.

### Літаратура


1. Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – 620 с.
2. Гардзееў, Ю. Тызенгаўз / Ю. Гардзееў // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2007. – 792 с.
3. Кулагін, А. М. Свяцкі палацавы-паркавы ансамбль / А. М. Кулагін, В. Р. Анціпаў // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – 620 с.
4. Кулагін, А. М. Станіславоўская сядзіба / А. М. Кулагін // Архітэктура Беларусі: энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў [і інш.]. – Мінск: Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 1993. – 620 с.
5. Чаропка, С. Сака / С. Чаропка // Вялікае княства Літоўскае: энцыкл.: у 2 т. – Т. 2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2007. – 792 с.


**А. А. Литвинова, Л. Ю. Еременко** *(Минск, Беларусь)*

## ИННОВАЦИОННЫЕ МЕТОДЫ СОВРЕМЕННОГО АРХИТЕКТУРНО-ДИЗАЙНЕРСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ (НА ПРИМЕРЕ СОТРУДНИЧЕСТВА КОМПАНИИ «LANIFICIO FACTORY», РИМ, ИТАЛИЯ И АРХИТЕКТУРНОГО ФАКУЛЬТЕТА БЕЛОРУССКОГО НАЦИОНАЛЬНОГО ТЕХНИЧЕСКОГО УНИВЕРСИТЕТА)

Отражение современных архитектурных тенденций в реальном и учебном проектировании является необходимой составляющей образовательного процесса будущих архитекторов-дизайнеров. Инновационные идеи современной архитектуры и дизайна лежат в основе разработки концепций курсовых и дипломных проектов, магистерских и кандидатских исследований кафедры «Дизайн архитектурной среды» архитектурного факультета БНТУ.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ